# *Гродзеншчына: мінулае і сучаснае*



## *Вандроўка па вобласці*

## *Гістарычная даведка*

Першыя жыхары на тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны, як сцвярджаюць вучоныя, з'явіліся яшчэ ў познім палеаліце. Пра гэта сведчаць знаходкі, зробленыя археолагамі каля вёсак Чарэшля (Навагрудскі раён), Нясілавічы (Дзятлаўскі раён), Збляны (Лідскі раён), у вусці ракі Котра (прыток Нёмана) і на возеры Svіцязь. Менавіта ў гэтых мясцінах знаходзіліся стаянкі першабытнага чалавека.

Напрыканцы і ў пачатку II тысячагоддзя на тэрыторыі, якую займае сёння Гродзенская вобласць, акрамя ўсходнеславянскіх плямёнаў (дрыгавічоў, крывачоў, валынян і драўлян) жылі таксама прадстаўнікі заходнеславянскіх (мазаўшане), усходнебалцкіх (літва) і заходнебалцкіх (яцвягі) плямёнаў. Паступова (прыкладна XII –XIII ст.) балты былі асіміляваны славянамі.

Да пачатку XII ст. частка земляў сучаснай Гродзеншчыны (Верхняе Панямонне) увайшла ў склад старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі.

14 жніўня 1385 г. у мястэчку Крэва (сучасны Смаргонскі раён) было падпісана пагадненне (Крэўская унія) аб саюзе паміж ВКЛ і Польскім Каралеўствам для сумеснай барацьбы супраць знешняга агрэса –Тэўтонскага ордэна.

Значнае сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Вялікага княства Літоўскага ў XIII –XVI ст. паўплывала і на росквіт земляў, якія займае сучасная Гродзенская вобласць. Нездарма менавіта Гродна ў 1391 г. адным з першых у ВКЛ, пасля Брэста (1390), атрымаў магдэбургскае права, спачатку няпоўнае, але з 1496г. эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных нормаў, якія адпавядалі ролі горада як цэнтра вытворчасці і таварна-грашовага абмену.



Разам з правам на самакіраванне горад атрымаў і свой герб: на блакітным фоне алень святога Губерта з залатым чатырохканцовым крыжам паміж перасковае церез плот. Пасля Гродна магдэбургскае права атрымалі і іншыя гарады і мястэчкі Панямоння: Ваўкавыск (1503), Навагрудак (1511), Слонім (1531), Мір (1579), Ліда (1587).

У 1793 г. рашэннем надзвычайнага Гродзенскага сойма, апошняга сойма Рэчы Паспалітай, было створана Гродзенскае ваяводства. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) землі, якія займае сучасная Гродзенская вобласць, адышлі да Расійскай імперыі, а ваяводства было пераўтворана ў



Гродзенскі павет Слонімскай губерні. 21 верасня 1801 г. была ўтворана Гродзенская губерня з цэнтрам у Гродна. Герб губерні быў зацверджаны 11 ліпеня 1802 г. Ён уяўляў сабой шчыт, у верхняй, чырвонай частцы якога знаходзійся сярэбраны вершнік з узнятым мячом і сярэбраным шчытом з васьміканцовым чырвоным крыжам, у ніжніяй частцы герба змяшчалася выява зубра. У ліпені 1878 г. Гродзенская губерня па Указе расійскага імператара Аляксандра II атрымала новы герб: у чырвоным шчыце, над якім змяшчалася залатая гарадская карона, знаходзілася выява залатога зубра, шчыт абкружаў стужкай блакітнага колеру. У аснову сучаснага герба Гродзенскай вобласці, зацверджанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь №279 ад 14 чэрвеня 2007 г., пакладзены менавіта гістарычны герб 1878 г.

У снежні 1918 г. Гродзенская губерня ўваходзіць у склад Літвы. 20 верасня 1944 г. была створана Гродзенская вобласць з цэнтрам у Гродне.

## *План мерапрыемстваў*
## *ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка”*
## *да 75 – годдзя з часу ўтварэння Гродзенскай вобласці (1944)*

| № п/п | Назва мерапрыемства | Форма правядзення | Тэрмін правядзення | Адказны |
|---|---|---|---|---|
| 1 | “Гродзеншчыну мілую вітаю!” | выстава-юбілей | студзень | ф-л “Бастунская ІСБ” |
| 2 | “Гродзенская вобласць: 1944 – 2019” | кніжная выстава | студзень | ф-л “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” |
| 3 | “Гродненскай вобласці – 75 год” | краязнаўчая выстава | студзень | ф-л “Забалацкая ІСБ” |
| 4 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | урок гісторыі | студзень | ф-л “Беняконская СБ-МЭ” |
| 5 | “Гродзеншчына – наш легендарны край” | кніжная выстава | студзень | ф-л “Тракельская СБ” |
| 6 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | урок гісторыі | студзень | ф-л “Гіркаўская СБ” |
| 7 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | выстава - прагляд | студзень | ф-л “Місявіцкая СБ” |
| 8 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | урок гісторыі | студзень | ф-л “Больцішская ІСБ” |
| 9 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | выстава-прагляд | студзень | ф-л “Больцінікская СБ” |
| 10 | “Гродзеншчына - наш легендарны край” | кніжная выстава | студзень | ф-л “Нацкая СБ” |
| 11 | “Гродзенскай вобласці - 75” | урок гісторыі і культуры | студзень | ф-л “Радунская ГПБ” |
| 12 | “Гродзенская вобласць пачыналася так…” | гістарычны экскурс | студзень | ф-л “Пагародзенская СБ” |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 13 | “Слаўныя імёны зямлі Гродзенскай” | інфармацыйны дайджэст | красавік | раённая бібліятэка |
| 14 | “75 гадоў Гродзенскай вобласці: вехі гісторыі, этапы развіцця” | кніжна – ілюстрацыйная выстава | на працягу года | раённая бібліятэка |
| 15 | “Поэтами воспетый край” | літаратурна-музычная кампазіцыя | жнівень | раённая бібліятэка |
| 16 | “Па гарадам Гродзенскай вобласці” | завочнае падарожжа | верасень | ф-л “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” |
| 17 | “Любі і ведай родны свой край” | віктарына | верасень | ф-л “Воранаўская дзіцячая бібліятэка” |
| 18 | “Гродзенскай вобласці - 75” | урок гісторыі і культуры | верасень | ф-л “Радунская ГПБ” |
| 19 | “Край родны і любімы” | паэтычны вечар | верасень | ф-л “Бастунская ІСБ” |
| 20 | “Гродзенская вобласці. Літаратурная спадчына” | літаратурнае знаёмства | верасень | ф-л “Забалацкая ІСБ” |
| 21 | “Гродзенская вобласць пачыналася так…..” | гістарычны экскурс | верасень | ф-л “Пагародзенская СБ” |
| 22 | “Прыгажосць і гонар Прынёманскага краю” | гадзіна гонару | верасень | ф-лы ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” |
| 23 | “Гродзенская зямля – мая зямля, мой лёс” | вусны часопіс | верасень | раённая бібліятэка |
| 24 | “Гродзеншчына – наш легендарны край” | кніжная выстава | на працягу года | раённая бібліятэка |
| 25 | “Жыву і дыхаю, мой родны край, табою!” | кніжная выстава | на працягу года | ф-л “Воранаўская дзіцячая бібліятэка |
| 26 | “Пра родны край з любоўю” | кніжная выстава | на працягу года | ф-л “Пераганцаўская СБ” |
| 27 | “Мой край дарагі, старонка мая” | кніжная выстава | на працягу года | ф-л “Радунская ГПБ” |
| 28 | “Гродзеншчына – наш легендарны край” | кніжная выстава | на працягу года | ф-л “Бастунская ІСБ” |
| 29 | “Старонкі гэтых кніг – гісторыя краіны” | кніжная выстава | на працягу года | ф-л “Пагародзенская СБ” |

